Свіслацкая цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Да нас вярнууўся гонар наш - славуты "Свіслацкі кірмаш"



Свіслач 2014

# Шляхі гісторыі…

Мястэчка Свіслач у першай палове XIX стагоддзя было актыўным гандлёвым цэнтрам заходняга рэгіёна Беларусі. У гэты час свіслацкі кірмаш набывае міжнародны статус. Гандляваць сюды з’язджаліся купцы з розных краін свету: Расіі, Украіны, Аўстрыі, Прусіі, Францыі, Даніі, Турцыі, Польшчы. Усяго збіралася да трох-чатырох тысяч чалавек.

Заснаваў кірмаш уладальнік Свіслачы Вінцэнт Тышкевіч, які атрымаў прывілей Станіслава Аўгуста ад 16 студзеня 1783 года.

Першы кірмаш працаваў 15 жніўня 1792 года, а потым праводзіўся штогод: спачатку як двухтыднёвы, затым як месячны, з 25 жніўня па 25 верасня.

Асноўная частка гандлёвых аперацый пад час кірмашу адбывалася на рынкавай плошчы. Пауль Абрамсон у сваёй кнізе «Случай для более углубленного познания истории Свислочи» піша: “У самай сярэдзіне горада быў пабудаваны квадратны рынак, аздоблены спічастаю пірамідаю, што завяршалася пазалочаным шпілем. З чатырох бакоў да яго вялі шырокія вуліцы, забудаваныя прыгожымі дамамі, пакрытымі гонтай. У самым цэнтры рынку паміж вуліцамі Мсцібаўская і Рудаўская ўзносіўся прамавугольны гмах, вымураваны з каменя, з 48 крамамі”.  Акрамя памяшканняў для гандлю, на рынку знаходзіліся 5 пастаялых двароў, якія называліся "Пад Арлом (Аленем, Лебедзем, Валом, Аднарожцам)", аптэка, кафенгауз з більярдам для забавы прыезжых.

Кірмашы, якія праходзілі ў Свіслачы, у хуткім часе занялі ў Беларусі другое месца, саступаючы толькі Зэльве. Адзін з буйнейшых кірмашоў Беларусі – Свіслацкі – меў назву Успенскі.

На час кірмашоў прыпадалі канікулы ў гімназіі, і людзі, што з’язджаліся ў Свіслач з усіх бакоў, займалі вызваленыя студэнтамі памяшканні.

Уладальнік Свіслачы Вінцэнт Тышкевіч шчодра і па-панску прымаў гасцей у час кірмашоў, не забываў пра тых, «якія, жывучы з промыслаў, зарабляюць кавалак сумленнага хлеба». Купцам, што прыязджалі на кірмаш у Свіслач з Пецярбурга, Адэсы, Кішынёва, Астрахані і іншых замежных гарадоў, бясплатна выдзяляліся магазіны, за кожны плацілі толькі па рублю гарадскому пісару. Купцам хрысціянскага веравызнання неаднаразова раздавалі білеты ў тэатр, а яўрэям на шабас – суботняе свята, прадпісанае яўрэйскай рэлігіяй,  – выдзялялі па некалькі фунтаў рыбы кожнаму.

Кірмаш быў важнай падзеяй, якую з найвялікшай нецярплівасцю чакалі ўсе без выключэння. Гандляры спадзяваліся шмат утаргаваць, маладыя – натанцавацца, старыя – нагаварыцца. Сучаснік адзначае: “Нічога так не нагадвала замежныя воды, як Свіслацкі кірмаш. Той вялікі збор грамадзян, што жылі ў асобных дворыках, адведвалі адзін аднаго, рабілі прагулкі конна, пешшу, у павозках, якія штодня збіраліся на абеды, на балі, на публічныя маскарады, у тэатр. Дадайце да гэтага найпрыгажэйшую пару года і будзеце мець сапраўдны Карлсбад. Толькі без скалаў, без вежаў, без гарачых крыніцаў, без таго загранічнага смуроду, які нам б’е ў галаву, адурманьвае, нават даводзіць да непрытомнасці і толькі тады вяртае нам розум, калі ў кішэні адчуем пустэчу”.

Леан Патоцкі піша: “У 1806 годзе Свіслацкі кірмаш быў яшчэ цудоўнейшы, чым звычайна, бо звабіў да сябе найпершыя сямейства ў краі, найслыннейшых славутасцей, найпрыгажэйшую моладзь. Княгіня Францішкава і Мікалаева Сапегі, Радзівілава, Чацвярцінская, Варанецкая; графіні Феліксава, Антонава, Янава-Патоцкія, Хойзелева, лоўчая Касакоўская, шматлікія сямейства: Валовічаў, Ельскіх, Мікульскіх, Аскеркаў, Сегеняў, Булгарынаў, Палубінскіх, Біспінгаў, Алендзкіх, Радавіцкіх. Кожныя з іх займалі асобны дворык”.

Адной з важных частак кірмашоў того часу былі тэатральныя прадстаўленні. Пані Тышкевіч арганізавала ў мястэчку Свіслач прыгожы і элегантны тэатрык, у якім з падабранай групай аматараў разыгрывала французскія п’есы. Дзеі кірмашовага тэатра праводзіліся як у час гандлю, так і пасля яго. Яшчэ адной забавай на кірмашы былі конныя гульні.

Кірмаш у Свіслачы ўвекавечыў у сваёй акварэлі «На ярмарке в Свислочи» мастак Юліан Такарскі, які скончыў Свіслацкую гімназію.

Традыцыі культурнага жыцця Свіслачы пад час святочных таргоў, без сумнення, можна занесці ў скарбніцу сусветнай кірмашовай культуры, якая існуе на Свіслаччыне і сёння. Жывуць, адраджаюцца і перадаюцца з пакалення ў пакаленне адвечныя традыцыйныя рамёствы: ганчарства, бондарства, ткацтва, разьба па дрэву, пляценне з лазы і саломы.







## *Гандлёвая плошча пачатку XIX стагоддзя*




## *Карта гандлёвых адносін*



# Кірмаш у Свіслачы ў пачатку XX стагоддзя





# *Старадаўняй традыцыі жыць сёння…*

*Бадай, такога грандыёзнага свята, якое адбылося 24 жніўня 2013 года ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва "Латвія-Літва-Беларусь" і згодна з праектам Еўрасаюза "Супрацоўніцтва і культурны дыялог гарадоў Укмерге і Свіслач", жыхары раёна не ладзілі даўно. "Свіслацкі кірмаш" сабраў багата гасцей. На аздобленых вуліцах горада – малыя і дарослыя свіслачане. Весела бавілі час госці, якія паз'язджаліся да нас з розных куточкаў Беларусі. Завіталі на "Свіслацкі кірмаш" прадстаўнікі з Літвы, Латвіі і Польшчы. Яны таксама разам з іншымі ўдзельнікамі рэгіянальнага свята з задавальненнем падарожнічалі па XVIII стагоддзі, калі ў мястэчку Свіслач уладарыў граф Вінцэнт Тышкевіч.*

Асабліва шматлюднай, як і ў часы Тышкевіча, у гэты дзень была цэнтральная плошча, дзе адбываліся галоўныя дзеі "Свіслацкага кірмашу". Спачатку тэатралізаванае ўрачыстае адкрыццё свята. Не мог не ўразіць свіслачан і гасцей той момант, калі на галоўнай пляцоўцы ў прыгожай, багата ўбранай карэце тагачаснага стылю з'явіліся граф Вінцэнт Тышкевіч са сваёй жонкай, пляменніцай караля Рэчы Паспалітай Аўгуста Панятоўскага, Тэрэзай Панятоўскай, якія запрасілі ўсіх на "Свіслацкі кірмаш".

Традыцыі тагачаснага і сёлетняга Успенскага Свіслацкага кірмашу, калі на яго з'язджаліся купцы з усяго свету, а гэта, напэўна, заўважыў кожны з прысутных, цесна перапляліся. Аб гэтым сведчаць культурныя і дзелавыя сувязі з краінамі-суседкамі, якія садзейнічаюць адраджэнню і захаванню рэгіянальных традыцый.

Свіслаччына гасцінна вітала дэлегацыю з Літвы на чале з намеснікам мэра адміністрацыі самакіравання Укмергскага раёна Раландасам Яніцкасам, дэлегацыю з

Латвіі, якую ўзначаліў старшыня краявой думы Рундальскага краю Айварс Акманіс. Польшчу прадстаўляла дэлегацыя на чале з намеснікам старасты Гайнаўскага павета Анджэем Скепкам.

Старшыня раённага выканаўчага камітэта, ён жа кіраўнік арганізацыйнага камітэта рэгіянальнага свята "Свіслацкі кірмаш", А. М.Таргонскі сардэчна прывітаў удзельнікаў мерапрыемства, выказаўшы спадзяванні, што кожнаму яно прынясе шмат цікавых сустрэч і новых знаёмстваў, дазволіць дакрануцца да багатых традыцый свіслацкага краю.

Хто на кірмашы заўсёды ў самым цэнтры ўвагі? Зразумелая справа, што гэта народныя майстры. На Свіслацкі кірмаш, як і ў даўнія часы, яны з'ехаліся са шматлікіх куточкаў Беларусі, пераважна з Гродзеншчыны і Брэстчыны, а таксама з замежжа, каб прадставіць свае вырабы, здзівіць імі і прапанаваць набыць што-небудзь для гаспадаркі ці проста на памяць. Нямала ў нас і сваіх рамеснікаў, вырабы якіх могуць паспаборнічаць з вырабамі майстроў-прафесіяналаў, альбо нават паказаць такое, чаго ў цэлай краіне днём з агнём наўрад ці знойдзеш. Гэта датычыць нашага славутага майстра з Дабраволі Святаслава Лешчука. Ён займаецца апрацоўкай капа (нараст на дрэве), і ў яго руках нараджаюцца сапраўдныя цуды: вялізныя падлогавыя і невялічкія настольныя вазы для кветак, фруктаў, салодкіх ласункаў, а таксама бра, былі там і дзівосныя карціны з дрэва і шмат чаго іншага.

Непадалёку быў размешчаны сапраўдны стараражытны ткацкі станок, а побач з ім амаль такі ж самы, толькі намнога меншы і крыху ўпрошчаны. За ім – майстрыха Свіслацкага Дому рамёстваў Зоя Радзівонік давала майстар-клас усім, хто хацеў навучыцца гэтай не вельмі простай справе, ці проста паглядзець, як на вачах з каляровых нітак нараджаецца невялічкае палатно. Асабліва цікава было дзецям, якія з вялікім інтарэсам назіралі за ткацкім працэсам.

Не меньш цікавасці выклікалі майстар-класы па лозапляценні Наталлі Паплаўскай і саломапляценні

Ірыны Фунт. Людзі захапляліся цікавым відовішчам нараджэння новага кошычка ці іншага вырабу з лазы, здзіўляліся, якія цуды можна зрабіць са звычайнай саломы. А ў руках маладых умелых майстрых гэтыя цуды з'яўляліся, нібы ў казцы. Жанна Сыраежка здзіўляла ўменнем плясці паясы, рамяство, якім некалі ганарылася Свіслаччына.

З Гродна прыехалі майстры па лозапляценні, мастацкай апрацоўцы скуры, тэкстылю, вышывальшчыцы крыжыкам, разбяры па дрэве. У кожнага з іх была свая непаўторная манера выканання. Проста дзіўна, якія надзвычай прыгожыя вырабы можна зрабіць сваімі рукамі са звычайнай скуры. Адных толькі бранзалеткаў было такое мноства, што вочы разбягаліся, а яшчэ цудоўныя дамскія сумачкі, вокладкі для пашпарта і іншых дакументаў, футляры для акуляраў, кашалькі і шмат чаго іншага. Вельмі прыгожыя вырабы з дрэва, лазы, вышыўка – гэта няпоўны пералік таго, што было прадстаўлена на кірмашы майстрамі аматарскага аб'яднання «Гарадзенскі каларыт», якім кіруе Алена Чумрай. Майстрамі таго ж аб'яднання быў прывезены на агляд нацыянальны «Пакроў свету». Ён збіраўся па кавалачку (50х50 см) прадстаўнікамі многіх краін на Фестываль нацыянальных культур, радзімай якога з'яўляецца Гродна. Зараз гэта тры вялікія шматкаляровыя палотны, дзе ўпляліся, як кветкі ў вянок, культуры шматлікіх народаў, якія сёння жывуць у Беларусі. У будучым годзе, акурат на чарговым фестывалі, работа над «Пакровам свету» будзе завершана. Шмат кухонных прылад, выраблених з дрэва, і многа чаго іншага прывезлі майстры са Слоніма Алеся Іванова і Мікалай Яўтуха. З Ліды прыехала на кірмаш Ядвіга Стацэвіч з глінянымі вырабамі.

Прадставілі сваіх майстроў Роскі, Ваўкавыскі, Дзятлаўскі Дамы рамёстваў. Чаго там толькі не было, заставалася толькі здзіўляцца творчай выдумцы людзей з залатымі рукамі. Вялікая чарга дзяцей выстраілася каля майстрыхі з Пружан Наталлі Кунецкай, якая не

толькі пацешыла сваімі вырабамі, але яшчэ і рабіла ўсім жадаючым невялічкія малюнкі на тварах. Падставіць свае шчочкі выявілі жаданне амаль усе дзеці, якія прыйшлі на свята, таму работы для майстрыхі хапіла. А дзяўчынкі і хлопчыкі фарсілі з кветачкамі, матылькамі, лісточкамі, ягадкамі на шчочках і былі вельмі задаволеныя.

Вялікую цікавасць выклікалі і майстры з Прыбалтыкі, Польшчы, якія гасцілі ў нас на кірмашы. Лаура-Мацільда Ікерце прывезла з латвійскага горада Укмерге чорную кераміку. Вырабляе яна свае місачкі, збаны, збаночкі, кубачкі не на ганчарным крузе, а рукамі. Прыгожая майстрыха ў аўтэнтычным адзенні, якое яна пашыла сама, прыйшлася многім даспадобы, і нехта нават пачаставаў Лауру смачнымі грушамі, якія вельмі каларытна глядзеліся ў яе посудзе.

З Літвы прыехаў Андрус Зінкевічус са сваімі свістулькамі і іншымі вырабамі з дрэва. Дарэчы, свістулькі тыя не простыя, а зробленыя з дуба, якому пераваліла за 1000 гадоў. Вільма Мулевічутэ завітала з цудоўным стужкавым пляценнем, а мастак Сігітас Лапка са сваімі творамі. Цудоўныя керамічныя вырабы прыехалі разам з майстрам Мірославам Пяхоўскім з Польшчы. Высокія і нізенькія збаны, кубачкі, гаршчочкі-спарышы і яшчэ шмат чаго цікавага вырабляе гэты самавіты майстар.

Упрыгожыла свята і кампазіцыя, якую прадставілі аграсядзібы раёна. Асабліва пастараліся Яніна і Рышард Казюкі. Чаго там толькі не было! У невялічкай вясковай хатцы стаяў ложак, якому, напэўна, пераваліла за сто гадоў, побач была падвешана люлька з немаўляткам, на палічках стаялі прыгожыя вырабы з гліны, іншыя хатнія прылады, якія ўпрыгожвалі хатку. Зверху яе пільнавалі буслікі, яны сачылі за ўсім, што адбываецца навокал і прыкідвалі, каму з гасцей у бліжэйшы час прынесці маленькіх хлопчыка ці дзяўчынку. Непадалёку знаходзіўся ганчарны круг, на якім выраблялiся прыгожыя збаночкі. З другога боку стаяў стол з такімі прысмакамі, што прахожыя толькі слінкі глыталі. Побач

у маленькім азярочку плывалі качкі, цвілі лілії, а каля азярца «вырасла» невялікае дрэўца, якое зацвіло буйным цветам, нягледзячы на тое, што за акном канец жніўня. Гэта толькі маленькая частка кампазіцыі, на якую з задавальненнем любаваліся як свіслачане, так і госці горада.

Напярэдадні свята «Свіслацкі кірмаш» быў аб'яўлены конкурс-выстава «Кветкавая феерыя». У ім мелі магчымасць удзельнічаць як арганізацыі, так і ўсе жадаючыя. Конкурс праводзіўся па трох намінацыях: выстава кветкавага пано, кампазіцыя букетаў на вольную тэму і стварэнне элемента касцюма альбо ўпрыгожання з прыродных і іншых матэрыялаў у стылі XVIII стагоддзя. Арганізацыі вельмі добра пастараліся, і кветкавая выстава атрымалася надзвычай прыгожай.

Журы вельмі цяжка было вызначыць пераможцаў, але ўрэшце першае месца атрымала СШ №3 г. Свіслач, два другіх падзялілі паміж сабою ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама і РУП ЖКГ. Трэцяе месца прысуджана УКП «Бытабслугоўванне», гімназіі №1 імя К.Каліноўскага і ЦБУ №419 АСБ «Беларусбанк».

Для аматараў мастацтва была арганізавана выстава твораў мастакоў. Былі прадстаўлены работы маладых мастачак Юліі Сыраежкі, Вікторыі Бальшаковай, а таксама педагога школы мастацтваў Сцяпана Чудакоўскага і лепшыя дыпломныя работы былых выпускнікоў школы. Прывёз свае карціны мастак з Гродна Анатоль Бурчык і іншыя майстры кісці.

На працягу дня працавала мноства гандлёвых кропак Свіслацкага і Бераставіцкага філіялаў аблспажыўтаварыства, Ваўкавыскага мясакамбіната, Свіслацкага і Слонімскага быткамбінатаў, Гродзенскай абутковай фабрыкі і інш.

Асаблівы інтарэс выклікалі ў свіслачан корчмы, якія насілі цікавыя назвы «Пад лебедзем», «Пад адзінарожцам», «Пад арлом», «Пад валом» і «Пад аленем», дарэчы, так яны называліся і ў часы Тышкевіча. Гараджанам і гасцям прапанаваліся стравы беларускай,

польскай і яўрэйскай кухні. Вуліцы ў той дзень таксама мелі старажытныя назвы: «Варшаўская», «Рудаўская», «Мсцібаўская», «Брэсцкая».

Дзіцячая пляцоўка нагадвала дзіўную і чароўную краіну, дзе панавалі радасць і весялосць. Разнастайнасць атракцыёнаў, арэляў і каруселяў падарыла маленькім свіслачанам масу пазітыву. Станоўчы настрой выклікала і арганізаваная выстава работ дзіцячай творчасці. Для ласуноў – духмяны поп - корн, салодкая вата і разнастайнасць выпечкі.

А са сцэны каля Дома кіно ўсіх ветліва зазывалі паўдзельнічаць у конкурсах дзве чароўныя вядучыя – Алеся (рэжысёр РМЦ г.Свіслач Юлія Смольская ) і Мушка-хахатушку (вядучы метадыст па культурна-дасугавай дзейнасці РМЦ г.Смалявічы Ірына Гудойць). Яны ж аб'яўлялі выступаючых на сцэне артыстаў. Варта сказаць, што канцэртная праграма была разнастайнай. Парадаваў юных гледачоў і іх бацькоў канцэрт дзіцячай творчасці "Музычная феерыя" Свіслацкага раёна. Падарыла дзецям шчаслівыя імгненні народнае аматарскае аб'яднанне "Закрытыя твары" з Карэлічаў. Радасцю свяціліся вочы малых, якія разглядалі яркія маскі артыстаў. Цыркавымі нумарамі здзівілі і павесялілі артысты з Навагрудскага РДК. З адным з самых старажытных відаў беларускага мастацтва – батлейкай – пазнаёмілі гледачоў работнікі Лідскага раённага цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры, паказаўшы пастаноўку "Цар Ірад".

Эмацыянальнае ажыўленне, выбухі рогату выклікалі роставыя лялькі Смяшарыкі беларускага гульнявога тэатра "Лялькі для ўсіх" Дзятлаўскага РДК. Мультыплікацыйныя героі жартавалі, гулялі, ўключалі ў забавы гледачоў.

І вось на сцэне Свіслацкі народны тэатр "Памфлет" з мюзіклам "Ну, Воўк, пачакай!". Нашы артысты запомняцца яркай, таленавітай гульнёй і вакальным майстэрствам. Завяршылі канцэртную праграму на дзіцячай пляцоўцы разнастайныя конкурсы. А ў гэты час на гульнёвай пляцоўцы "Вясёлы

дворык” панавалі весялосць і смех. Тут з забаўляльнымі гульнёвымі, песеннымі і танцавальнымі праграмамі выступалі масавікі з Воранава, Ваўкавыска, Ліды, Бераставіцы, Грынок, Поразава, Ханявічаў, Ціхаволі. Конкурсы “Капялюш”, “Гарачы гаршчочак”, “Збяры бульбу”, “Прыказкі і прымаўкі”, “Хто каго перапяе” стварылі эмацыйны настрой і гульнёвы азарт на пляцоўцы. Гледачы актыўна ўключаліся ў гульні, з лёгкасцю пераўвасабляліся ў музыкаў, дэманстравалі свае вакальныя дадзеныя, удзельнічалі ў імправізацыях. І, вядома, ніхто не сышоў з пляцоўкі без заахвочвальных прызоў.

Шматлюдна было на галоўнай пляцоўцы ўвечары. Усе чакалі тэатралізаванага музычнага прадстаўлення “Баль у Тышкевіча”, які быў наладжаны ўзорным танцавальным калектывам “Усмешка” РДК і музычным домам “Класіка” г.Мінска пад краўніцтвам А.Чахоўскага. Дзякуючы яму сучаснікі на імгненне зазірнулі ў мінулае, дакрануліся да гісторыі, адчулі той дух, які панаваў на балях у XVIII стагоддзі. Гледачы знаходзіліся ў захапленні ад рамансаў пані Ірэны, новай мазуркі Агінскага, паланэза. Тут, напэўна, многія ўпершыню пазнаёміліся з танцамі тампэт і кантрданс. Завяршыўся, дарэчы, як і пачаўся, баль спеўным паланэзам.

Баль скончыўся, але свята было яшчэ ў разгары. Ніхто не спяшаўся дамоў, бо наперадзе ўдзельнікаў "Свіслацкага кірмашу” чакала дакументальная стужка пра свіслацкі край і захапляльнае вогненае шоу, падрыхтаванае тэатрам агню г.Мінска. Прадстаўленне, як і планавалася, было непаўторным і яскравым.

Свіслачане і шматлікія госці былі проста ў захапленні ад “Свіслацкага кірмашу”. Значыць, старадаўняй традыцыі жыць!




# Тэатралізаванае ўрачыстае адкрыццё свята





# *Цэнтральная плошча з захаваннем гістарычных элементаў*












*Славуты майстар з Дабраволі Святаслаў Ляшчук*





*Жанна Сыраежка здзіўляе ўменнем плясці паясы*

*Латвійская майстрыха Лаура-Мацільда Ікерце прадстаўляе чорную кераміку*





*За старажытным ткацкім станком – майстрыха Свіслацкага Дому рамёстваў Зоя Радзівонік*

*Майстрыха з Пружан Наталля Кунецкая ўсім жадаючым рабіла невялікія малюнкі на тварах*



# Вырабы народных майстроў









Нацыянальны "Пакроў свету" Гродзенскага фестывалю нацыянальных культур

# Вернісаж карцін Свіслацкіх мастакоў















## Яркія і самабытныя выступленні творчых калектываў







# Выстава-конкурс “Кветкавая феерыя”









# Дзіцячая пляцоўка





# Гульнёвы азарт - яркі атрыбут кірмашу





# "Баль у Тышкевіча"







# Захапляльнае выступленне тэатра агню "Fire-шоу" г.Мінск

